# МІФІЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ЖЫХАРОЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ ПРА ЧОРТА

**А.У. Бужан**

Беларуская міфалогія адна з самых цікавых і багатых у свеце. Яна ўвабрала ў сябе самабытныя старажытныя карані народнай свядомасці, мудрасці, прыгажосці. “Праўда, з цягам шматлікіх стагоддзяў, у выніку ўсемагчымых сацыяльных і эканамічных зрухаў, многае з міфалагічных першавобразаў назаўседы страчана. Яго ўжо проста немагчыма, нават пры ўсім нашым жаданні, вярнуць, узнавіць”.[1] Але сабраныя па кроплі ў народзе ўяўленні ўсё ж такі даюць магчымасць сучаснікам даведацца пра старажытныя вераванні беларусаў. У гэтай сувязі слушна заўважае вядомы фалькларыст У.Васілевіч, што “самая, бадай, выразная форма старажытных вераванняў – народная міфалогія”.[2] Беларуская дэманалогія характарызуецца вялікай колькасцю розных ніжэйшых міфалагічных істот, кожная з якіх мае сваю гісторыю і свае ўласныя адметнасці. Кожны персанаж быў створаны народам, паводле яго анімістычных уяўленняў і багатай фантазіі. Адсюль шмат цікавага і пазнавальнага ўбіраюць у сябе ўяўленні, звязаныя з антаганістам Дэміурга і Культурнага героя – чортам. Гэты персанаж у агульнаславянскай міфалогіі з’яўляецца злосным духам, спакуснікам. Месца нячысціка ў сістэме міфалагічных апазіцый па вертыкалі – ніз (балота, дрыгва), а па гарызанталі – левы кірунак. Хрысціянства істотна паўплывала на фармаванне аблічча гэтай істоты, якая ў выніку эклектычна спалучыла ў сабе антрапаморфныя і зааморфныя рысы. Звернемся непасрэдна да фактычных запісаў міфалагічных звестак, якія знаходзяцца ў фальклорным архіве кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф.Скарыны. Паводле народных уяўленняў жыхароў Гомельшчыны, чорт – “гэта нячыстая сіла” (в.Карма, Добрушскі раён), “паўчалавек, паўжывёла, увесь чорны-чорны, з доўгай барадой, з рагамі на лбе, увесь мурзаты і лупаты, мае доўгі хвост” (в.Рыжкаў, Брагінскі раён). Адны інфарматары сцвярджаюць, што “чорт увесь час знаходзіцца ў пекле” (Гомель), але ёсць і ўяўленні аб тым, што “чорт жыве ў балоце. Ноччу чэрці вылазяць і пугаюць людзей, танцуюць“(в.Галавінцы, Гомельскі раён). Называюць чорта па-рознаму: “нячысцік, іскусіцель” (в.Малейка, Брагінскі раён), “нячысты, ліха, нялёгкі” (в.Нісімкавічы, Чачэрскі раён), “той”

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(Буда-Кашалёўскі раён), “сатана” (Мазырскі раён), “бес, д’ябл, нячыстая сіла” (в.Асмолавічы, Рагачоўскі раён).

Чорт, як сведчыць сабраны матэрыял на Гомельшчыне, увесь час сочыць за чалавекам, спакушаючы яго на розныя дрэнныя ўчынкі. Ён нашэптвае на левае вуха, каб чалавек ішоў і рабіў тое, што скажа яму чорт, “паслушна рабіў яго падказкі” (в.Сінічына, Буда-Кашалёўскі раён). Чорт дапамагае тым, “хто хоча душу прадаць” (в.Сінічына, Буда-Кашалёўскі раён). “Ён мог падкупіць чалавека грашыма, багаццем, гарэлкай” (в.Малейка, Брагінскі раён). Акрамя стасункаў з людзьмі, чорт мае дачыненне і да іншых дэманалагічных істот. Ён дапамагае ведзьмакам і чарадзеям. Распазнаць чорта можна па рогату. Існавала павер’е, што калі чалавек з’яўляецца самазабойцам, то душу яго забірае чорт. Людзі маглі і прадаць сваю душу гэтаму злому духу, так казалі пра тых, “што варажыць умелі, порчу наводзіць ды знімаць, лёс прадказваць, прываражваць і адваражваць” (в.Асмолавічы, Рагачоўскі раён). Фактычны міфалагічны матэрыял, запісаны на Гомельшчыне, багаты звесткамі аб здольнасці чорта пераўвасабляцца ў іншых істот: змяю, ката, свінню, казла, сабаку, нават і ў чалавека.

Народныя мясцовыя ўяўленні, звязаныя з чортам, знайшлі сваё яскравае адлюстраванне і ў былічках, дзе нечысць паўстае ў шматлікіх іпастасях. Гэтыя народныя аповеды характарызуюцца разнастайным зместам і своеасаблівымі паводзінамі чорта, якому надаюцца звышнатуральныя якасці і ўласцівасці. Выяўляюцца нават слабасці гэтага злога спакусніка. Так, у адной з мясцовых былічак чорт вельмі любіў золата, а каб здабыць яго, змог нават лятаць: “У адзін двор багаты кожны дзень лётаў чорт за золатам, ляціць – аж свеціцца, а як пятух прапяе – ён улятае” (г.Добруш). Сустракаюцца і былічкі, якія маюць больш сучасны характар увасаблення сюжэта. Вядомы аповеды, якія ў народзе атрымалі назву “Жарты чорта”. Паводле іх зместу, чорт нясе зло і спакусу людзям. Як правіла, яны заканчваюцца для чалавека дрэнным вынікам. Таямнічыя сілы прадстаюць як варожыя, толькі адмоўныя. Некаторыя якасці чорта гіпербалізуюцца. У гэтых былічках фігурыруе не толькі сам чорт, але і людзі, адлюстроўваюцца адносіны паміж чалавекам і чортам. Згодна з сюжэтам былічак, чорт можа браць шлюб з жанчынай, а апошняя, у сваю чаргу, можа нарадзіць ад чорта дзіця. Чалавек, які меў стасункі з нячыстым духам, іншы раз набывае ўласцівасці, нехарактэрныя для людзей, але ж сам ён (чалавек) аб гэтым не будзе здагадвацца.

Увогуле, звесткі, сабраныя на Гомельшчыне пра чорта, даюць падставу сцвярджаць, што гэты персанаж малюецца толькі з адмоўнага боку; ён спакушае людзей без відавочных для гэтага прычын. На гэтую дэманалагічную істоту перанесліся нават рысы людскіх характараў, іх знешнія якасці. Усё дмоўнае, што было ў чалавеку, адлюстравалася ў паводзінах, дзеяннях чорта. Людзі, у сваю чаргу, баяцца чорта, не называюць часта яго імя, бо, па іх уяўленнях, гэты нячысцік можа з’явіцца.

Як бачым, прыведзеныя звесткі пра чорта сведчаць аб тым, што не ўсё пахаваў у сваёй несмяротнасці час, шмат лакальнага, самабытнага і індывідуальнага захавалася ў народных уяўленнях Гомельшчыны. Адсюль і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вынікае важнасць збору і вывучэння міфалагічных звестак, якімі надзвычай багата Палессе. Нельга не пагадзіцца з выказваннем даследчыцы Т.Шамякінай, што "веданне нацыянальнай міфалогіі непазбежна абвастрае свядомасць людзей, што для беларусаў сёння вельмі важна".[3] Адзначым, што свет іх дэманалагічных уяўленняў працягвае сваё існаванне, набірае моц і рэалізуе фантазію чалавека ў яскравых і каларытных формах.

Літаратура:


1. Ненадавец А.М. За смугою міфа. Мн., 1999. – С.250 -251.
2. Васілевіч У. Зямлёю адкрытае – не забытае // Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999.– С.15
3. Шамякіна Т. Міфалогія і яе значэнне // Роднае слова. 1993. №7. – С.53